

Самая маленькая парафія ў Новай Рудзе ледзь ці не ўпершыню ў сваёй гісторыі сабрала такую вялікую колькасць вернікаў з розных мясцовасцей. У гэты дзень 24 чэрвеня адбылося ўрачыстае заканчэнне перэгрынацыі абраза Езуса Міласэрнага, які за год трапіў ва ўсе касцёлы нашай дыяцэзіі. Уласна арыгінал іконы, напісаны Казіміроўскім паводле сведчанняў св. Фаўстыны Кавальскай, вельмі доўга захоўваўся ў касцёле ў Новай Рудзе. 30 гадоў абраз Езуса Міласэрнага знаходзіўся паміж прэсбітэрыем і нефам высока на сцяне, ажно пакуль не ўзнікла пагроза яго знікнення. Абраз патаемна вывезлі ў Вільню. Некаторыя ўдзельнікі той складанай аперацыі таксама прысутнічалі на ўрачыстай св. Імшы з нагоды заканчэння перэгрынацыі абраза Езуса Міласэрнага.

*Поўны тэкст матэрыяла чытайце ў новым нумары газеты "Слова жыцця", які з'явіцца на парафіях 8 ліпеня.*